8. Жукович, П. Управление и суд в Западной России в царствование Екатерины II / П. Жукович // Журн. М-ва нар. просвещения. – 1914. – № 2. – С. 287–288.
9. Некрасов, В.Ф. МВД России: энциклопедия / В.Ф. Некрасов. – М. : Олма-пресс, 2002. – 623 с.
10. Киселев, А.А. Структура, состав и деятельность земской полиции белорусских губерний в конце XVIII – первой половине XIX вв. / А.А. Киселев // Исторический поиск Беларуси : альманах / сост. А.Ю. Бендин ; редкол.: Б.М. Лепешко (гл. ред.) [и др.]. – Минск : Эконом-пресс, 2006. – С. 36–52.
11. Живописная Россия – Отечество наше в его земельном, историческом, племенном, экономическом и бытовом значении : в 12 т. / под ред. П.П. Семенова. – СПб. ; М. : Изд. книгопродавца-типографа М.О. Вольфа, 1881–1901.
12. Черданцев, А.Ф. История государства и права : учеб. для вузов / А.Ф. Черданцев. – М. : Юрайт, 2000. – 298 с.
13. Польша против Российской империи. История противостояния / сост. Н.Н. Малишевский. – Минск : Букмастер, 2010. – 704 с.
14. Рогалев, А.Ф. Белая Русь и белорусы (в поисках истоков) / А.Ф. Рогалев. – Гомель : [б. и.], 1994. – 267 с.
15. Голубеў, В.Ф. Ці ведаеце вы гісторыю сваёй краіны? / В.Ф. Голубеў, У.П. Крук, П.А. Лойка. – Мінск : Нар. асвета, 1994. – 133 с.
16. Белорусы / отв. ред.: В.К. Бондарчик, Р.А. Григорьева, М.Ф. Пилипенко. – М. : Наука, 1998. – 502 с.

Дата поступления в редакцию: 01.03.16

***A.S. Zhmurovsky**, Candidate of Historical Sciences, Associate Professor at the Department of Theory and History of state and law of the Academy of the MIA of the Republic of Belarus*

THE HISTORY OF CREATION OF ADMINISTRATIVE STRUCTURE OF BELARUSSIAN GOVERNS (THE END OF THE XVIII − THE BEGINNING OF XIX c.)

*The process of the formation, structure, tasks and functions of the executive bodies of the administrative-directive structures of the Belorussian provinces during three divisions of Rech Pospolita.*

*Keywords: structure, functions, executives bodies, formation.*

УДК 930

***А.М. Сувалаў**, кандыдат гістарычных навук, дацэнт, дацэнт кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права Акадэміі МУС Рэспублікі Беларусь*
*(e-mail: suvalau@tut.by)*

## АСНОЎНЫЯ ТЭНДЭНЦЫІ РАЗВІЦЦЯ ГІСТАРЫЯГРАФІІ ЭТНАГЕНЕЗУ БЕЛАРУСАЎ У НАВУЦЫ КАНЦА XVIII − ПАЧАТКУ XXI ст.

*Разглядаюцца асноўныя тэндэнцыі ў вывучэнні беларускага рэгіёна ў канцы XVIII – пачатку XXI ст., калі інтарэс да беларусаў і іх этнічнага паходжання набываў навуковы характар. Этнагенезам беларусаў у гэты час цікавяцца вучоныя з рознымі, часам супрацьлеглымі поглядамі на этнічную прыналежнасць і этнічную гісторыю Беларусі. Аналізуюцца пазіцыі расійскай афіцыйнай навукі, прыхільнікаў «заходнерусізму» і прадстаўнікоў беларускай плыні.*

*Ключавыя словы: беларусы, этнагенез, гістарыяграфія, навуковая канцэпцыя, археаграфія, этнаграфія, «заходнерусізм», этнас.*

Першы перыяд навуковага вывучэння праблемы этнагенезу беларусаў ахоплівае час канца XVIII – пачатку XIX ст. і мае надзвычай асаблівае значэнне ў самой пастаноўцы пытання і характары яго вырашэння. Далучэнне зямель этнічнай Беларусі да Расійскай імперыі ў выніку трох падзелаў Рэчы Паспалітай і Тыльзіцкага міру 1807 г. востра паставіла перад расійскімі навукоўцамі праблему неабходнасці вывучэння здабытага рэгіёна. Пастаноўка пытання вызначэння этнічнай прыналежнасці насельніцтва Беларусі ва ўмовах надзвычай вострых палітычных канфліктаў канца XVIII – пачатку XIX ст. адчула моцны ўплыў палітычнага і ідэалагічнага фактараў. Вынікам стала сітуацыя, калі пры практычнай адсутнасці навуковых даследаванняў па гісторыі, этнаграфіі, фальклору і мовазнаўству Беларусі ў асноўных сваіх рысах былі сфармуляваны дзве першыя канцэпцыі этнагенезу беларусаў: велікаруская (асноўныя прадстаўнікі: А.І. Сабалеўскі, І.І. Сразнеўскі, У. Даль і інш.) і польская (асноўныя прадстаўнікі: Л. Галамбёўскі, І. Штрыттэр, С. Ліндэ, А. Рыпінскі і інш.). Агульны іх сэнс прадвызначыла супрацьстаянне польскага і рускага пачаткаў, а менавіта імкненне кожнага з бакоў давесці свае, у тым ліку і нацыянальныя правы на

землі Беларусі. Адсюль і лагічны вынік падобных падыходаў: беларусам было адмолена ў праве на этнічную самастойнасць, яны прызнаваліся часткай адпаведна рускага ці польскага народаў у залежнасці ад таго, прыхільнікам якога цывілізацыйнага пачатку выступаў той ці іншы аўтар.

З указанага вышэй зразумела і тое, чаму пры даволі вялікім інтарэсе да набытых зямель гістарыяграфія менавіта навуковых даследаванняў праблемы параўнальна невялікая па аб'ёму. Сітуацыя таго часу сама па сабе вымагала з'яўленне публікацый, прызваных навукова даказаць правы велікарускага ці польскага бакоў на Беларусь. Адпаведна цяжка чакаць у такіх абставінах панавання чыста навуковых, пазбаўленых палітызаваных высноў і ідэалагічнай перадузятасці манаграфій і даследаванняў. Палітычныя падзеі, сярод якіх уласна самі падзелы Рэчы Паспалітай, вайна 1812 г. з яе праэктамі аднаўлення Вялікага княства Літоўскага (знакамітыя праекты М.К. Агінскага), паўстанні 1830–1831 і 1863–1864 гг. не спрыялі спакойнаму аналітычнаму вывучэнню рэгіёна Беларусі і памежных з ёй зямель.

Такім чынам, першыя па часе ўзнікнення канцэпцыі этнагенезу беларусаў узніклі тады, калі грунтоўныя навуковыя даследаванні па ўказанай праблеме практычна адсутнічалі, а само фарміраванне ўказаных канцэпцый было інсперавана палітычнай і ідэалагічнай неабходнасцю. Гэтымі абставінамі тлумачыцца і сітуацыя з вызначэннем прыналежнасці саміх навукоўцаў у пазнейшых гістарыяграфічных даследаваннях: у аснову аднясення таго ці іншага аўтара да ліку польскіх або рускіх была пакладзена мова іх выданняў. Гэты крытэрый хутчэй указваў на палітычную ці культурную арыентацыю таго ці іншага публікатара, чымсці на яго этнічную прыналежнасць ці навуковую зарыентаванасць. Вядомы прыклад, калі адзін з заснавальнікаў славяназнаўства Я. Добраўскі ўсе свае навуковыя тэксты пісаў па-нямецку. Гэта не перашкодзіла пазнейшым даследчыкам тытулаваць яго «бацькам славяназнаўства». У сітуацыі з нашым рэгіёнам вынікам абрання толькі аднаго крытэрыя – мовы публікацый – для вызначэння прыналежнасці даследчыка да ліку польскіх ці рускіх стала тое, што беларускія даследчыкі гэтага перыяду (З. Даленга-Хадакоўскі, А. Міцкевіч, Я. Чачот, А. Рыпінскі, П. Шпілеўскі і інш.) «губляліся» як нацыянальныя навукоўцы для беларускай гістарычнай навукі і «падзяляліся» паміж польскай і рускай навукамі.

Перыяд 30–80-х гг. XIX ст. характарызаваўся некалькімі дамінуючымі тэндэнцыямі ў вывучэнні пытання этнагенезу беларусаў. Першая з іх была звязана з паступовай зменай мовы публікацый матэрыялаў па беларусазнаўству. Калі ў першы перыяд вывучэння праблемы дамінавала польская мова публікацый, на якой раней атрымлівалі адукацыю ў Беларусі, то з 30-х гг. XIX ст. у сувязі з афіцыйна праводзімай палітыкай «русіфікацыі» і пераводам навучання ў навучальных установах на рускую мову дамінуючай становіцца сапраўды руская. Тое самае можна сказаць і пра саміх публікатараў: у вывучэнні разглядаемай праблемы пачынаюць дамінаваць рускія і рускаарыентаваныя аўтары, дзе апошнія былі прадстаўлены плынню «заходнерусізма». З'яўленне ідэалогіі «заходнерусізма», яе сутнасць указваюць на яе штучны характар, звязаны не з навуковымі падставамі, а з інспіраваннем падобных пазіцый палітыкамі, зацікаўленнымі ў адрыве беларусаў ад «дрэннай» польскай цывілізацыі і зліцця іх у адзіную цывілізацыю з велікарусамі – «рускую цывілізацыю». Другая тэндэнцыя – пашырэнне колькасці і, што вельмі важна, якасці публікацый па гісторыі, этнаграфіі, фальклору і мовазнаўству Беларусі. Пры захаванні моцнага ціску палітыкі і ідэалогіі на публікацыі па ўказанай тэматыцы, агульнае развіццё славяназнаўства, рост прафесіяналізму публікатараў і г. д. станоўча сказаліся на развіцці беларусазанаўства. Вынікам развіцця гэтай тэндэнцыі стала сітуацыя, пры якой матэрыял той ці іншай публікацыі часцей не супадаў з высновамі аўтараў. Так было, калі па замацаваўшайся ў той час традыцыі пэўны аўтар імкнуўся даказаць польскі ці рускі (заходнерускі) характар этнічнай прыналежнасці беларусаў, а прыведзенныя ім у якасці доказаў матэрыялы аб'ектыўна сведчылі на карысць этнічнай самастойнасці беларускага этнасу. Такім чынам, пры наяўнасці ўсіх неабходных матэрыялаў, дастатковых для прызнання этнічнай самастойнасці беларусаў, падобнае прызнанне ў перыяд 30–80-х гг. XIX ст. не адбылося ў першую чаргу як следства палітычнай незацікаўленасці ў гэтым аўтараў, даследчыкаў і ў першую чаргу палітыкаў.

На канец XIX ст. гістарычная навука характарызавалася працэсам паступовай змены навуковых накірункаў, калі ў расійкай навуцы ў галіне вывучэння гісторыі славян адбываецца канчатковы пераход ад рамантычных тэорый да пазітывізму. Назапашаны ў папярэдні перыяд развіцця навукі колькасны інтэлектуальны вопыт у 90-я гг. XIX ст. пачаў пераходзіць у новую якасць. Менавіта гэты перыяд адзначыўся фарміраваннем першай навуковай канцэпцыі этнагенезу

беларусаў – крывіцка-дрыгавіцка-радзіміцкай канцэпцыі Я.Ф. Карскага, якая ў канчатковым варыянце была выкладзена ў знакамітых «Беларусах» [1]. Згодна з канцэпцыяй прафесара (а пазней акадэміка) Я.Ф. Карскага беларусы прызнаваліся трэцім самастойным усходнеславянскім народам, які сфарміраваўся ў XIII ст. на аснове трох славянскіх плямёнаў (крывічоў, дрыгавічоў і радзімічаў) з удзелам неславянскіх элементаў (некаторых плямёнаў балтаў) і паасобных груп іншых усходніх славян.

Нацыянальны рух пачатку XX ст. і дзяржаўнае будаўніцтва ў Беларусі пасля 1917 г. прывялі да пэўнага пашырэння «крывіцкай» канцэпцыі В. Ластоўскага (вывозділа беларускі этнас ад славянскага племені крывічоў), якая ў далейшым не атрымала шырокага распаўсюджання.

У савецкі перыяд даследаванні па этнагенезу беларусаў грунтаваліся на новай метадалагічнай аснове, а менавіта на марксізме-ленінізме. У аснову афіцыйна прынятай у савецкай гістарычнай навуцы была пакладзена канцэпцыя Я.Ф. Карскага. З тымі ці іншымі нюансамі яна трансліравалася ў публікацыях А.П. П'янкова, М.С. Дзяржавіна, У.М. Перцава, М.Я. Грынблата, В.Ц. Пашуты, Я.І. Карнейчыка і інш. Асаблівасцю паслярэвалюцыйнай гістарыяграфіі стала актыўная барацьба супраць рознага роду буржуазных падыходаў да разгляду мінулага Беларусі, «выкрывальніцтва» немарксісцкіх поглядаў, што ў хуткім часе вылілася ў рэпрэсіі. Дарэчы трэба адзначыць, што ў Беларусі рэпрэсіі ў дачыненні да вучоных і інтэлігенцыі пачаліся досыць рана ў параўнанні з іншымі рэгіёнамі СССР: з другой паловы 20-х гг. XX ст. Першапачаткова любыя спробы стварэння новай канцэпцыі этнагенезу беларусаў ці любая аўтарская падача гістарычнага матэрыялу прыводзілі да абвінавачванняў у нелаяльнасці да савецкай улады, немарксісцкім мышленні і г. д. У далейшым адступнік у лепшым выпадку губляў магчымасць далейшай працы, а ў горшым – трапляў пад больш жорсткія рэпрэсіі, звязаныя са стратай свабоды ці жыцця. Гэтым тлумачыцца як рэзкае скарачэнне навуковых публікацый у гэты час, так і значнае падзенне якасці саміх даследаванняў. З'яўляюцца тэмы, закрытыя для перагляду, ці самастойнай трактоўкі аўтараў. У шэрагу такіх стала і праблема паходжання беларусаў, іх этнічная гісторыя.

Паколькі савецкая гістарычная навука традыцыйна адмаўляла спадчыну дарэвалюцыйнай навукі, то і самі даследаванні вучоных дасавецкага перыяду, якія не падзялялі марксісцкіх установак, працяглы час не публікаваліся і не падлягалі сур'ёзнай навуковай ацэнцы. Да гэтага дадалася яшчэ і неабходнасць крытыкі гэтак званых «буржуазных» і «нацыяналістычных» канцэпцый паходжання беларусаў, якія ўзніклі напярэдадні і пасля 1917 г. Складанасць падобнай крытыкі абцяжарвалася адсутнасцю саміх прац «нацдэмаў» у бібліятэках, таму што рэпрэсіі супраць вучоных суправаджаліся «ачышчэннем» фондаў архіваў і бібліятэк ад «шкоднага нацдэмаўскага хлама».

У некаторай ступені сітуацыя мяняецца з пачатку 50-х гг. XX ст., калі Інстытутам гісторыі АН БССР было распачата комплекснае даследаванне тэмы паходжання беларусаў. Выхадам значнай колькасці манаграфій і артыкулаў, прысвечаных тэме этнагенезу беларусаў, адзначыліся 60-я гг. XX ст. [2, 3]. Дамінуючай асаблівасцю ўказанага часу стала тое, што з пачатку 50-х гг. XX ст. фарміруецца канцэпцыя пра старажытнарускую народнасць як агульную этнічную калыску трох братніх усходнеславянскіх народаў: велікарусаў, украінцаў і беларусаў [4, 5]. Адбываецца карэкціроўка афіцыйнай савецкай канцэпцыі этнагенезу беларусаў: паходжанне беларусаў выводзіцца не непасрэдна да летапісных плямён полацка-смаленскіх крывічоў, дрыгавічоў, радзімічаў з дадаткам паасобных груп іншых славян з удзелам балцкага насельніцтва, як тое было ў Я. Карскага. Яны фарміруюцца пасля прахаджэння яшчэ адной прамежкавай стадыі: стадыі аб'яднання ўсіх славянскіх плямён Усходняй Еўропы ў адзіную супольнасць – «старажытнарускую народнасць». Указаная канцэпцыя, якая ўзнікла ў палітычных колах (сама ідэя звычайна прыпісваецца І.В. Сталіну) і павінна была падкрэсліць еднасць усходніх славян у мінуўшчыне, тым самым гістарычна абгрунтаваць ідэю фарміравання новай супольнасці – савецкага народа, пра фарміраванне якога шырока пачалі казаць у часы праўлення М.С. Хрушчова. Не гледзячы на тое, што пераканаўчых доказаў існавання з IX па XIII ст. н. э. старажытнарускай народнасці прыведзена не было, указаная канцэпцыя працягвае сваё існаванне ў паасобных публікацыях да сённяшняга часу.

Пасляваенны перыяд савецкай гістарыяграфіі працягвае ранейшую традыцыю непажаданасці перагляду існуючых на той час трактовак этнічнай гісторыі беларусаў. Самастойнасць у гэты перыяд праяўлялі бадай толькі даследчыкі, што належалі да беларускай замежнай дыяспары. Аднак на радзіме іх творы не публікаваліся. Таму для большасці тагачасных айчынных аўтараў яны былі ці проста нявядомымі, ці свядома інгараваліся. Час ад часу навуковыя працы замежнікаў падвяргаліся разгромнай крытыцы ў айчыннай гістарыяграфіі, галоўным аргумен-

там якой было падкрэсліванне іх «буржуазнага» і «ідэалагічна шкоднага» характару. Не жадаючы залішне папулярызаваць дасягненні ідэалагічных праціўнікаў, айчынныя аўтары таго часу практыкавалі такую форму крытыкі, калі адмоўна ацэньваючы погляды сваіх апанентаў, даследчык мог не зрабіць ніводнага ўказання на канкрэтныя даследаванні і нават не назваць прозвішчаў сваіх апанентаў [6]. Указаны момант выяўляе ўмовы працы айчынных спецыялістаў пасляваеннага часу, а таксама тлумачыць, чаму першыя спробы ў СССР перагляду падыходаў да этнагенезу беларусаў належаць не камусьці з мясцовых вучоных, а маскоўскаму даследчыку В.В. Сядову, аўтару «тэорыі балцкага субстрату» [7]. Пры гэтым вучоны не здзейсніў нічога надзвычайнага: навукова падцвердзіў тое, пра што казалі некаторыя расійскія даследчыкі яшчэ ў XIX ст.

Перагляд існуючых схем, здзейснены В.В. Сядовым, быў падхоплены айчыннымі беларускімі даследчыкамі М.І. Ермаловічам, Г.В. Штыхавым і інш. [8, 9]. У Мінску ў 1973 г. была запланавана навуковая канферэнцыя, прысвечаная праблеме этнагенезу беларусаў. Задачай, якую ставіла перад беларускімі вучонамі тагачаснае партыйнае кіраўніцтва рэспублікі, было навуковае абвяржэнне пазіцыі В.В. Сядова, М.І. Ермаловіча і іх прыхільнікаў. Але надрукаваныя да канферэнцыі матэрыялы ў сваёй большасці сведчылі на карысць удзелу «балцкага субстрата» у этнагенезе беларусаў, выходзілі за рамкі афіцыйнай канцэпцыі паходжання беларусаў і іх этнічнай гісторыі [10]. Канференцыя была забаронена, надрукаваныя матэрыялы сталі недаступымі для вучоных.

Наступны перыяд вывучэння разглядаемай праблемы пачынаецца з сярэдзіны 80-х гг. XX ст. і характарызуецца перш за ўсё значным ростам колькасці публікацый па праблеме этнічнай гісторыі беларусаў. Сярод падобных публікацый трэба ўзгадаць, па-першае, «Этнаграфію беларусаў» [11] і манаграфію М.Ф. Піліпенкі, прысвечаную новай канцэпцыі этнагенезу беларусаў [12]. Станоўчым момантам з’явілася і шырокае выкарыстанне даных генетыкі і антрапалогіі беларусаў пры разглядзе праблемы іх этангенезу, вывучэнне праблемы ў комплексе ці праз агульнаславянскі кантэкст.

Асаблівасцю сучаснага перыяду – перыяду незалежнай Беларусі – з’яўляецца вывучэнне праблемы этнагенезу беларусаў з прыцягненнем значна большай колькасці крыніц. Напрыклад, былі перавыдадзены і такім чынам сталі больш даступнымі работы З. Даленгі-Хадакоўскага, І. Турчыновіча, М. Без-Карніловіча, М. Каяловіча, Ф. Булгарына, А. Пыпіна, Э. Ажэшкі, Я. Карскага, А. Ельскага, В. Ластоўскага і інш. Этнічныя працэсы на землях Беларусі сталі складаючай часткай комплексных даследаванняў, напрыклад калектыўнай манаграфіі, падрыхтаваннай Інстытутам гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі «На шляху станаўлення беларускай нацыі» [13].

Частка айчынных аўтараў час ад часу вяртаецца да савецкіх трактовак пачатковай этнічнай гісторыі ўсходніх славян у выглядзе адзінага старажытнарускага народа. Пры гэтым падкрэсліваецца менавіта этнічная еднасць старжытнарускай народнасці [14, с. 42, 48–49], што не заўсёды было характэрна нават для савецкай гістарыяграфіі. Але дамінуючымі тэндэнцыямі сучаснага перыяду айчыннай навукі выступаюць панаванне плюралізму ў падыходах да азначанай праблемы; адсутнасць новых, «прарыўных» тэорый і канцэпцый; пашырэнне кола навуковых дысцыплін, матэрыялы якіх уключаюцца ў пабудову навуковых канцэпцый. Вынікам развіцця ўказаных тэндэнцый становіцца ўласна навуковы аналіз праблемы этнагенезу беларусаў, пазбаўлены ў значнай ступені ненавуковых фактараў: палітыкі і ідэалогіі.

1. Карский, Е.Ф. Белорусы : в 3 т. / Е.Ф. Карский. – Вильна : Изд. Вилен. генерал-губернатор. упр., 1904. – Т. 1 : Введение к изучению языка и народной словесности. – X, 466 с.

2. Гринблат, М.Я. Белорусы: очерки происхождения и этнической истории / М.Я. Гринблат. – Минск : Наука и техника, 1968. – 288 с.

3. Карнейчык, Я.І. Беларуская нацыя : гіст. нарыс / Я.І. Карнейчык. – Мінск : Навука і тэхніка, 1969. – 309 с.

4. Токарев, С.А. О культурной общности восточнославянских народов / С.А. Токарев // Совет. этнография. – 1954. – № 2. – С. 21–32.

5. Тихомиров, М.Н. Значение Древней Руси в развитии русского, украинского и белорусского народов / М.Н. Тихомиров // Вопр. истории. – 1954. – № 6. – С. 19–26.

6. Абецедарский, Л.С. В свете неопровержимых фактов / Л.С. Абецедарский // Дары данайцев / сост. И.Н. Осинский. – Минск : Беларусь, 1987. – С. 24–89.

7. Седов, В.В. О происхождении белорусов / В.В. Седов // Древности Белоруссии: материалы конференции по археологии Белоруссии и смежных территорий / Акад. наук БССР, Отд-ние обществ. наук, Ин-т истории ; под ред. В.Ф. Исаенко [и др.]. – Минск, 1966. – С. 301–309.

8. Ермаловіч, М. Па слядах аднаго міфа / М. Ермаловіч. – Мінск : Навука і тэхніка, 1989. – 94 с.

9. Штыхаў, Г. Насельніцтва зямель Беларусі ў IX–XIII ст.: вытокі беларускай народнасці / Г. Штыхаў // З глыбі вякоў: наш край : гіст.-культурал. зб. – Мінск : Крок уперад, 1992. – С. 15–40.
10. Этногенез белорусов : тез. докл. науч. конф., Минск, 3–6 декабря 1973 г. / АН БССР, Ин-т искусствоведения, этнографии и фольклора. – Минск : [б. и.], 1973. – 243 с.
11. Этнаграфія беларусаў: гістарыяграфія, этнагенез, этнічная гісторыя / В.К. Бандарчык [і інш.]. – Мінск : Навука і тэхніка, 1985. – 215 с.
12. Пилипенко, М.Ф. Возникновение Белоруссии: новая концепция / М.Ф. Пилипенко. – Минск : Беларусь, 1991. – 143 с.
13. На шляху станаўлення беларускай нацыі: гістарыяграфічныя здабыткі і праблемы / В.В. Яноўская [і інш.] ; навук. рэд. В.В. Яноўская. – Мінск : Беларус. навука, 2011. – 311 с.
14. Трещенок, Я.И. История Беларуси : в 2 ч. / Я.И. Трещенок ; науч. ред. М.И. Матюшевская. – 2-е изд. – Могилев : МГУ им. А.А. Кулешова, 2004. – Ч. 1 : Досоветский период. – 296 с.

Дата поступления в редакцию: 25.03.16

***A.M. Suvalau***, *Candidate of Historical Sciences, Associate Professor, Lecturer at the Department of Theory and the History of State and Law of the Academy of the MIA of the Republic of Belarus*

PRIMARY TENDENCIES OF HISTORIOGRAPHY ETHNOGENESIS DEVELOPMENT OF BELARUSIANS IN SCIENCE OF THE END OF XVIII − THE BEGINNING OF XXI C.

*The features of investigation of the Belarusian region at the end of XIX – early XX century are discussed in the article. At that time the interest towards ethnic Belarusians and their origin becomes scientific. At that time different scientists, with sometimes opposing views on the ethnicethnic identity and the history of Belarus, were intrested in the ethnogenesis of Belarusians. Positions of Russian official science, representatives of «zahodnerusizm» and Belarusian science are analysed in the article.*

*Keywords: Belarusians, ethnogenesis, historiography, scientific conception, archeology, ethnography, «zahodnerusizm», ethnicity.*

УДК 329(09)

***Е.Н. Сувалова***, *старший преподаватель кафедры философии и идеологической работы Академии МВД Республики Беларусь*
*(e-mail: elenasam@tut.by)*

## СТРАТЕГИЯ И ТАКТИКА ПОЛИТИЧЕСКИХ ПАРТИЙ РОССИИ И БЕЛАРУСИ В ВЫБОРЕ ПУТЕЙ ОБЩЕСТВЕННОГО И НАЦИОНАЛЬНОГО РАЗВИТИЯ В 1917−1918 гг.: ИСТОРИОГРАФИЧЕСКИЙ АСПЕКТ

*Исследуется историография проблемы изучения стратегии и тактики политических партий России и Беларуси в выборе путей общественного и национального развития в период 1917–1918 гг. за время от первых публикаций послереволюционного периода до современности.*

*Ключевые слова: политические партии, социалистическая революция, национальный вопрос, историография, общественное развитие.*

Рассматриваемый период имеет одну из самых обширных историографий, и его научные исследования начали проводиться практически сразу после Октябрьской социалистической революции. В советское время большинство диссертационных работ в той или иной мере касались событий 1917 г., разнообразия в подходах и оценках которого особо не отмечалось. Основной упор в содержании делался на историю одной партии – большевиков, в контексте взаимосвязи с которой исследовались остальные партии и общественные организации. С точки зрения того, что большевики пришли к власти, подобный подход вполне логичен и понятен. Однако значимую ценность могли иметь и исследования других партий с бóльшим числом сторонников, чем партия большевиков. Изучение партий как самостоятельных субъектов истории представляет на современном этапе большой научный интерес, так как трактовка деятельности других партий с точки зрения большевистской идеологии, имевшая место в советской исторической науке, существенно отличалась от объективной. Влияние советской идеологии на изучение рассматриваемой проблемы проявилось в том, что большевистский подход к решению вопросов общественного развития и национального вопроса рассматривался как самый прогрессивный, разрешающий обозначенные проблемы бывшей Российский империи.